Игра «Дорисуй/придумай узор». Детям предлагается рассмотреть выложенные из конструктора коврики и выложить недостающую часть узора, либо самостоятельно придумать узор.

Игра «Чудо-Юдо». Выделение отдельных компонентов образа позволяет ребёнку соединить детали разных образов, придумывая новые фантастические объекты или явления. Так, ребёнок может представить животное, соединяющее в себе части многих животных и поэтому обладающее такими качествами, которых нет ни у одного существующего животного в мире [3, с. 27].

**Заключение.** Хочется подчеркнуть безграничные возможности использования LEGO-конструктора в педагогической деятельности, обратить внимание на его исключительную способность быть актуальным, многофункциональным и мобильным. Средствами данного конструктора можно решить большинство педагогических задач, при условии соблюдения определенных технологических процессов. LEGO-технология характеризуется высокой речевой, социальной и деятельностной активностью. Ребёнок занимает исключительно активную позицию, включаясь в различные технологические этапы:

– постановка задачи / проблемной ситуации / выбор темы;
– использования конструирования как средства включения ребёнка в данную тему;
– возможность самостоятельного решения поставленной задачи путем действий, сопряженных с экспериментированием, опытом, сравнительным анализом;
– презентация/обобщение/выводы/высказывания о своей работе.

**Список цитируемых источников**

1. *Кряжева, Н. Л.* Развитие эмоционального мира детей / Н. Л. Кряжева. — М. : МПСИ, 2013. — 184 с.
2. *Цвынтарный, В. В.* Играем пальчиками и развиваем речь / В. В. Цвынтарный. — СПб. : Лань, 1996. — 158 с.
3. *Болба, Н. Г.* Развитие связной речи детей дошкольного возраста средствами LEGO-конструирования / Н. Г. Болба, Е. В. Лемеш, С. В. Сабурова. — Минск : Мин. обл. ин-т развития образования, 2017. — С. 24—27 с.

УДК 373.2

**А. Я. Маршалак**
*Дзяржаўная ўстанова адукацыі «Санаторны яслі-сад № 9 г. Смаргоні», Смаргонь*

# НАВУЧАННЕ І ВЫХАВАННЕ ДЗЯЦЕЙ СТАРШАГА ДАШКОЛЬНАГА ЎЗРОСТУ СРОДКАМІ ТЭАТРАЛІЗАВАНАЙ ГУЛЬНІ

**Уводзіны.** Тэндэнцыя цяперашняга жыцця такая, што першаснай задачай у развіцці дашкольніка дарослыя вылучаюць назапашванне ведаў і ўменняў, неабходных яму для аптымальнай арыентацыі ў свеце камп'ютарызацыі і новых тэхналогій. Пра гэта сведчыць мноства гаджэтаў і прылад у руках дзіцяці. Невыпадкова даследчыкі гэтай праблемы (А. Ю. Коркіна, С. Л. Навасёлава і інш.) непакояцца аб фізічным і псіхічным здароўі тых дзяцей, якія аддаюць перавагу камп'ютарным гульням замест традыцыйных.

Менавіта таму, як адзначае Э. Г. Чурылава, сучасныя дзеці сталі радзей захапляцца і здзіўляцца, адчуваць і суперажываць, яны ўсё часцей праяўляюць абыякавасць і чэрствасць, яны не разважаюць адзін з адным, а іх інтарэсы абмежаваныя. Дзеці з цяжкасцю знаходзяць сабе прымяненне, не імкнуцца да пераадолення цяжкасцяў [1]. Найбольш кароткі шлях да паляпшэння сітуацыі — стварэнне спрыяльных умоў для натуральнай дзіцячай гульні, казкі, фантазіі, пазнання і творчасці. Мы прыйшлі да высновы, што знайсці выхад з негатыўнага ўплыву сучаснасці дапаможа тэатралізаваная гульня, якая з'яўляецца адным з любімых відаў творчай дзейнасці дзяцей, яна блізкая і зразумелая дашкольніку, паколькі ў яе аснове ляжыць натуральная гульня. Патрэба ў гульні ў дзяцей вялікая. Такім чынам, праз адчуванне станоўчых пачуццяў і эмоцый дзіцяці тэатралізаваная гульня максімальна ўздзейнічае на ўзбагачэнне яго ўнутранага свету, развівае, забаўляе і выхоўвае (Л. В. Арцёмава, Т. Н. Даронава, Л. В. Куцакова, М. Д. Маханёва, С. І. Мерзлякова, Е. В. Мігунова, Л. А. Тарасава і інш).

Мэтай нашага даследавання з'явілася тэарэтычнае абагульненне і метадалагічнае забеспячэнне працэсу навучання і выхавання сродкамі тэатралізаванай гульні. Задачы, якія мы вырашалі ў працэсе даследавання: прааналізаваць змест вучэбнай праграмы дашкольнай адукацыі для старшай групы ў вызначаным кірунку; раскрыць сістэму работы па пастаноўцы тэатралізаваных гульняў з дзецьмі старшага дашкольнага ўзросту.

**Асноўная частка**. Выбар дадзенага напрамку працы звязаны з некаторымі асаблівасцямі вучэбнай праграмы дашкольнай адукацыі: асобная галіна, якая вырашае задачы толькі па развіцці тэатралізаванай дзейнасці, тут не прадугледжана. Дадзеныя задачы ўключаны ў комплексы асобных адукацыйных абласцей.

© Маршалак А. Я., 2019



Рэпазіторый БарГУ

Дзіця і грамадства. Гульнявая дзейнасць. Фарміраваць уменне размяркоўваць ролі.

Развіццё маўлення і культура маўленчых зносін. Звязнае маўленне. Выразная перадача дыялогаў дзеючых персанажаў.

Дзіця і грамадства. Пазнанне соцыума. Фарміраваць уяўленні аб народным лялечным тэатры.

Мастацтва. Мастацкая літаратура. Садзейнічаць далейшаму далучэнню да тэатральна-гульнявой дзейнасці. Развіваць уменне перадаваць у ролі настрой, характар персанажа. Імкнуцца да выразнай перадачы вобраза (руху, інтанацыя, міміка), самастойна і выразна весці сваю ролю ў спектаклі.Фарміраваць уменне прымаць удзел у падрыхтоўцы спектакля як акцёр, афарміцель сцэны і інш.

Такім чынам, на дзяржаўным узроўні задачы па развіцці тэатралізаванай дзейнасці ў дзяцей старшага дашкольнага ўзросту вырашаюцца комплексна. Пры гэтым змест задач не канкрэтызаваны, носіць абагульняючы характар[2; 3].

Улічваючы дадзены факт, мы прапаноўваем унесці ў адукацыйны працэс навізну: мэтазгодна штомесяц працаваць над новай тэатралізаванай гульнёй на працягу навучальнага года, лагічна ўключаючы папярэднюю працу, падрыхтоўку атрыбутаў і працу па сцэнарыю ў перспектыўнае планаванне адукацыйнага працэсу на месяц. Пры гэтым кожная тэатралізаваная гульня мае аўтарскі сцэнарый, сутнасць якога ў наступным: за аснову новай тэатралізаванай гульні-казкі аўтар бярэ сюжэт з вядомай дзецям народнай казкі, укладае ў новы змест сваё напаўненне і выхаваўчы кампанент — галоўную ідэю казкі. Тэкст аўтарскай тэатралізаванай гульні-казкі атрымліваецца ў вершаванай форме, лёгкай для ўзнаўлення дзецьмі дашкольнага ўзросту.

Пры гэтым мы прапаноўваем наступную сістэмы работы па пастаноўцы тэатралізаваных гульняў.

*Першы этап* — работа аўтара над тэкстам і зместам тэатралізаванай гульні, пасля чаго выхавальнік падводзіць дзяцей да разумення тэмы, галоўнай ідэі тэатралізаванай гульні праз папярэднюю працу: гутаркі дарослага з дзецьмі, мастацкія ілюстрацыі, праслухоўванне музычных твораў, чытанне вершаў, выяўленчая дзейнасць, прагляд мультфільмаў і г. д. Затым адбываецца знаёмства з тэкстам тэатралізаванай гульні, яго аналіз. Пажадана, каб выхавальнік знаёміў з казкай, выкарыстоўваючы які-небудзь від тэатра (напрыклад, тэатр на фланелеграфе, настольны тэатр ці інш.), пры гэтым мова і інтанацыя дарослага павінна быць выразнай, дакладнай, яркай.

*Другі этап* прадугледжвае дзяленне сцэнарыя тэатралізаванай гульні на эпізоды. Дзеці пераказваюць кожны эпізод, дапаўняючы адзін аднаго, прыдумваюць ім назву.

*Трэці этап* — праца над асобнымі эпізодамі ў форме эцюдаў з імправізаваным тэкстам. Спачатку ўдзельнікамі эцюдаў становяцца самыя актыўныя дзеці, але паступова трэба, не прымушаючы, уключаць у гэты працэс усіх выхаванцаў групы.

*Чацвёрты этап* — знаёмства дзяцей з музычнымі творамі, якія цалкам або ва ўрыўках будуць гучаць у спектаклі. Спачатку дзеці проста імправізуюць рухі пад музыку. Затым яны рухаюцца, ператвараючыся ў які-небудзь персанаж, змяняючы хаду, паставу, жэсты, назіраючы адзін за адным. Адначасова ў нерэгламентаванай выяўленчай дзейнасці дзеці вучацца ствараць элементы дэкарацый і касцюмаў, робяць малюнкі асобных эпізодаў тэатралізаванай гульні па творчай задуме.

*Пяты этап* — паступовы пераход да тэксту тэатралізаванай гульні. На рэпетыцыях адзін і той жа ўрывак паўтараецца рознымі выканаўцамі, г. зн. адзін і той жа тэкст гучыць шмат разоў, што дазваляе дзецям даволі хутка вывучыць практычна ўсе ролі. Педагог, улічваючы маўленчыя, пластычныя, акцёрскія магчымасці дзяцей, можа намеціць па 2-3 выканаўцы, здольных справіцца з канкрэтнай роляй.

*Шосты этап* — праца над роляй. Нельга навязваць юным выканаўцам логіку дзеянняў іншага чалавека ці свае канкрэтныя ўзоры паводзін. Гэта прыводзіць да запраграмаванасці паводзін. Вельмі важна дамагацца ўзаемадзеяння з партнёрамі, уменне чуць і слухаць адзін аднаго і адпаведна змяняць свае паводзіны.

*Сёмы этап* — рэпетыцыя асобных эпізодаў.

*Восьмы этап* — рэпетыцыі ўсяго сцэнарыю цалкам. Калі да гэтага дзеці дзейнічалі ва ўмоўных дэкарацыях, з умоўнымі прадметамі (вялікія кубы, крэслы, палкі, хустачкі, сцяжкі), то зараз выкарыстоўваюцца падрыхтаваныя для спектакля дэкарацыі, бутафорыя і рэквізіт, а таксама элементы касцюмаў, якія дапамагаюць у стварэнні неабходных абставін. Рэпетыцыя ідзе з музычным суправаджэннем: выхады герояў, гукі прыроды і г. д. На гэтым этапе замацоўваюцца абавязкі дзяцей у падрыхтоўцы рэквізіту і змене дэкарацый. У залежнасці ад магчымасцяў і падрыхтаванасці калектыву колькасць агульных рэпетыцый ўсяго спектакля можа быць ад адной да трох.

*Дзявяты этап* — прэм’ера тэатралізаванай гульні — з’яўляецца адначасова генеральнай рэпетыцыяй, бо да гэтага моманту дзеці ні разу не дзейнічалі ў касцюмах. Абмеркаванне прэм’еры не мае сэнсу праводзіць адразу ж пасля выступлення. Дзеці занадта ўзбуджаны і наўрад ці змогуць ацаніць свае поспехі і няўдачы. Але ўжо на наступны дзень у гутарцы можна высветліць, наколькі крытычна яны здольныя ставіцца да ўласнай тэатральнай ігры. Адказваючы на пытанні, што было добра, а што не, дзеці вучацца ацэньваць шчырасць і праўдзівасць паводзін на сцэне, адзначаць выразнасць і знаходлівасць асобных выканаўцаў. Педагог, накіроўваючы размову ў патрэбнае рэчышча сваімі пытаннямі, стараецца ўказаць на асноўныя прамашкі і недахопы, але ў той жа час пахваліць дзяцей і адзначыць найбольш удалыя і цікавыя моманты выступлення.

Рэпазіторый БарДУ

*Заключны этап* — паўторныя паказы. Дзецям не надакучвае іграць адно і тое ж. Спектаклі можна выконваць у розных варыянтах. Задача педагога — раскрыць індывідуальнасць дзіцяці, навучыць яго шукаць свае выразныя сродкі, а не пераймаць іншых выканаўцаў. Працу над пастаноўкай і кожны спектакль пажадана фіксаваць (стэнды з фотаздымкамі, выставы дзіцячых малюнкаў, відэазапіс). Вельмі цікава параўноўваць відэазапісы некалькіх спектакляў.

**Заключэнне.** Намі выяўлены ўмовы, неабходныя для навучання і выхавання сродкамі тэатралізаванай гульні: 1) змястоўнасць і разнастайнасць тэматыкі; 2) планамернае і паслядоўнае ўключэнне элементаў тэатралізацыі ў адукацыйны працэс; 3) максімальная актыўнасць дзяцей на ўсіх этапах падрыхтоўкі і правядзення гульняў; 4) супрацоўніцтва дзяцей адзін з адным і з дарослымі на ўсіх этапах тэатралізаванай гульні (Л. В. Арцёмава); 5) наладжванне педагагічнага кіраўніцтва так, каб абуджаць уяўленне дзіцяці, ствараць умовы для вынаходлівасці, творчасці дзяцей (С. А. Казлова, Т. А. Кулікова); 6) арганізацыя актыўнага супрацоўніцтва з педагогамі, спецыялістамі, бацькамі; 7) развіццё кожнага паказчыка адукацыйнага працэсу ў гульнявой сітуацыі, падпарадкаванай сюжэту тэатралізаванай гульні.

**Спіс цытаваных крыніц**


1. *Чурилова, Э. Г.* Методика и организация театрализованной деятельности дошкольников и младших школьников: программа и репертуар / Э. Г. Чурилова. — М. : ВЛАДОС, 2004. — 159 с.
2. Учебная программа дошкольного образования / М-во образования Респ. Беларусь. — Минск : Нац. ин-т образования. — 2013. — 416 с.
3. *Смолер, Е. И.* Особенности содержания театрализованной деятельности детей в учреждениях дошкольного образования Республики Беларусь и РФ / Е. И. Смолер, А. Е. Маршалак // Дошкольное детство в современном поликультурном пространстве : Междунар. науч.-практ. конф., г. Минск, 2 нояб. 2017 г. / Белорус. гос пед. ун-т им. М. Танка. — Минск : БГПУ, 2017.


УДК 378.091.2:373.2.011.3-051


**А. С. Матяс, Н. Ф. Захарченя**
*Учреждение образования «Барановичский государственный университет», Барановичи*


# ОСОБЕННОСТИ ФОРМИРОВАНИЯ ПЛАНЕТАРНОГО МЫШЛЕНИЯ ДЕТЕЙ ДОШКОЛЬНОГО ВОЗРАСТА

**Введение.** Планетарное мышление — умение личности видеть мир в его целостности, ощущать себя его самоценной и системообразующей частью. Проблема формирования планетарного мышления заключается в том, что для формирования гармонично развитой личности необходимо разработать и внедрить такие педагогические технологии, с помощью которых у ребёнка будут формироваться представления о целостности окружающего мира, значимой роли каждого человека в нём, ощущение себя как его самоценной и системообразующей части.

**Основная часть.** На основе анализа психолог педагогической и философской литературы мы можем выделить основные особенности формирования планетарного мышления у детей дошкольного возраста [1; 3]. Одна из особенностей — взаимосвязь биологического и социального планов развития — предполагает, что лишь при тесном взаимодействии биологического и социального планов развития возможно формирование планетарного мышления. По мере совершенствования психических процессов у дошкольников появляются задатки для перенятия опыта старших поколений. Для того, чтобы связать биологический и социальный план развития, взрослым необходимо создать специальную образовательную среду, в котором будет проходить процесс социализации [2; 4].

При формировании планетарного мышления у дошкольников необходимо создать условия для протекания интеллектуально-нравственного развития ребёнка. Для воспитания таких качеств личности, как патриотизм, дисциплинированность, трудолюбие, честность, необходимо понимать и принимать этические идеалы общества, которые на данный промежуток времени составляют общечеловеческую мораль [8, с. 132—141].

При рассмотрении особенностей формирования планетарного мышления у дошкольников необходимо обратить внимание на такие процессы, как индивидуализация и социализация. Социализация — процесс усвоения индивидом определенных знаний и навыков, норм и ценностей, общепринятых правил поведения, дальнейшее использование которых обеспечит наиболее продуктивное взаимодействие в социуме [7, с. 50]. Индивидуализация — это процесс развития и самореализации человека, в ходе которого происходит выделение себя как самостоятельной, самоценной единицы общества, выявление и осознание своих индивидуальных качеств и характеристик [7, с. 50].

© Матяс А. С., Захарченя Н. Ф., 2019



Репозиторий БарГУ